Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Цана асобнага нумару 20 грош.

# ЖЫЦЬЦЁ БЕЛАРУСА

Выходзіць тры разы ў тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12 — 6. (Wilenska 12. m. 6).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзен. Адміністр. ад 9 да 3

Падпіска на адзін месяц з дастаукай да хаты 2 зл. Для заграніцы удвая даражэй.

**Перамена адрэса 30 грошы.**

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 гр., за радок пэтыту ў 1 шп.

№. 10. Вільня, Субота, 10-га кастрычніка 1925 г. Год I.

## Разлад сярод буржуазіі.

Падобна таму, як працоўныя масы дзеляцца на дзьве вялізарныя групы: працоўных места і працоўных вёскі, так і буржуазія дзеліцца на дзьве часьці: мястовую, ці фабрычна-прамысловую і торговую — з аднаго боку, ды вясковую, або зямельную, абшарніцкую, — з другога.

Паскольку сіла працоўных залежыць ад самае цеснае еднасьці працаўнікоў места і вёскі, пастольку і панаваньне буржуазіі заўсёды апіраецца на аб'яднаньні зямельных абшарнікаў з капіталістамі, фабрыкантамі, ды гандлярамі-спэкулянтамі. Апошняе зьявішча мы бачылі дагэтуль і ў Польшчы.

Але згода між абшарнікамі і фабрыкантамі трывала датуль, пакуль і адны і другія згодна імкнуліся да паняволеньня і вясковага сярмяжніка, і мястовага работніка. Цяпер— на нашых вачох — згода гэная пачала псавацца.

Сварка між абшарнікамі і мяшчанскімі партыямі ўзьнялася на груньце так-званае „зямельнае рэформы", ці, правільней, правядзеньня праз Сойм урадавага законапраекту аб *прымусовай* парцэляцыі часткі панскіх зямель між польскімі асаднікамі—перад усім на нашых „крэсах".

Справа іменна ў прымусовасьці. Польская мястовая буржуазія, як у 1905 годзе расейская, бачучы ў польскай вёсцы ўзрост нездавольства істнуючымі парадкамі, пастанавіла коштам часткі дворных абшараў—перад усім „крэсавых"—заспакоіць зямельны голад сярод польскага сялянства і частку малазямельных польскіх хлебаробаў абярнуць у „кулакоў", правёўшы гэтак клясавае расслаеньне ў вёсцы і навязаўшы польскім асаднікам на беларускіх і ўкраінскіх землях ролю вельмі непачэсную... Але, бачучы, што абшарнікі, якія гвалту крычаць, што ім так цяжка гаспадарыць, зямлі самахоць аднак-жа не прадаюць,—павадыры мястовае буржуазіі наважыліся *прымусіць* да гэтага ўласьнікаў дворных зямель.

Вось прычына сваркі.

З гэтае прычыны абшарнікі аб'явілі байкот найвялікшай з польскіх буржуазных партыяў — так-званым эндэкам, якіх дагэтуль „кармілі" сваімі грашмі. У выніку гэтага галоўная эндэцкая газэта — „Gazeta Warszawska"—ужо зачынілася з галадухі. А вось цяпер абшарніцкая прэса распачала выразна паход і проці ярка буржуазнага ўраду братоў Грабскіх, сыплючы яму розныя пагрозы...

Мала таго: група абшарніцкіх дэпутатаў Сойму зьвярнулася да Лігі Народаў з просьбай ратаваць іх двары ад „пакушэньня" Сойму на „сьвятое права ўласнасьці"... Выступленьне гэтае маршалак Сойму, п. Ратай, на першым-жа паседжаньні Сойму востра асудзіу, як замах на свабоду пастаноў Сойму...

Урэшце, абшарнікі рэзка разыйшліся з мястовай буржуазіяй у пытаньні аб найвышэйшай дзяржаўнай уладзе ў Польшчы. Мястовая буржуазія бароніць „дэмакратычную рэспубліку", якая выродзілася ў найвыгаднейшую для буржуазіі форму панаваньня над працоўнымі. Абшарнікі ж выразна імкнуцца да ўвядзеньня ў Польшчы каралеўскае ўлады. Так, на зьезьдзе ў Варшаве $3^1/_2$ тысячы польскіх паноў зрабілі гучную манархістычную маніфэстацыю: калі ў аднэй рэзалюцыі нехта запрапанаваў словы „прэзыдэнт рэспублікі" замяніць славамі „галава дзяржавы", дык гэтая папраўка была і нязвычайна горача аднадушна прынята, як знак, што абшарнікі імкнуцца да замены прэзыдэнта — каралём....

Узьняўшаяся сварка між мястовай і зямельнай буржуазіяй зусім натуральна павінна *аслабіць адзіны дагэтуль буржуазны фронт* у Польшчы. *І з гэтага мусяць перад усім скарыстаць працоўныя.*

Працоўныя места і вёскі мусяць у гэты мамэнт асабліва цесна аб'яднаць свае сілы, мусяць стварыць перад усім *адзіны палітычны фронт* і на арэне палітычнае барацьбы павясьці дружную *контр-атаку* проці ўсіх наскокаў падзяліўшаеся і аслабіўшае свой фронт буржуазіі.

Такі наказ павінны слаць усе працоўныя сваім дэпутатам у Сойме на распачаўшуюся толькі што соймавую сэсію.

**СЯЛЯНЕ!** Памятайце, што **„Жыцьцё Беларуса"** — гэта **вашая газэта**, якая няухільна бароніць вашыя нацыянальныя і сацыяльныя інтэрэсы, а істнаваньне яе залежыць ад Вас. Дзеля гэтага **акуратна шліце падпісныя грошы.** Хто у цяжкую пару задоужыуся, хай цяпер, сабраушы з поля, **адашле свой доуг.**

## Наш дом.

Вось, што піша абшарніцкая газэта „Słowo" ў нумары з 7-га кастрычніка.

Беларускі Нацыянальны Камітэт, прадстаўлены п. Антонам Луцкевічам, мае незалежніцкую ідэалёгію, якая ў.ё выразьней скланяецца да Саветаў. Гэтая апошняя малачысьленая група, якая знаходзіцца цяпер у блізкім кантакце з новапаўстаўшай на соймавым груньце фракцыяй пад назовам Работніцка-Сялянская Грамада, дагэтуль у сваей дзеяльнасьці старалася ўкрываць сваё запраўднае абліччa.

Аднак, цяпер відаць, пастаноўлена зьняць заслону і ў артыкуле п. н. „Крысталізацыя Нацыі" ў сканфіскаваным апошнім нумары „Жыцьця Беларуса" пішацца вось што:

„...перад беларускім народам, хаця й ня зразу, не без перашкодаў, адкрываюцца шырокія гарызонты. Там—на Усходзе—у Радавай Беларусі народныя масы самы бяруць уладу ў свае рукі. І зусім натуральна, што беларускі адраджэнскі рух, беларуская культурна-нацыянальная праца падтрымліваецца ўсім дзяржаўным апаратам БССР.

„Нарадзіны работніцка-сялянскае ўлады ў Усходняй Беларусі зусім зьмянілі кірунак так-званае крысталізацыі нацыі".

Стацьця канчаецца гэткім клічам:

„Радзім усім ад шчырага сэрца: калі хочаце адыграць нейкую ролю ў будаваньні беларускае нацыі, калі хочаце нешта сваё ўкласьці ў агульна-нацыянальную беларускую скарбніцу,—**варочайцеся да дому!**".

Што азначае заклік варочацца да дому і дзе гэны дом знаходзіцца, цяпер, здаецца, ня будзе сакрэтам ні для кога. Калі хто-небудзь меў якія сумляваньні аб групе п. Луцкевіча, што яна здолее працаваць у рамках польскае дзяржаўнасьці, дык апошняя заява разьвявае іх аканчаньна".

Так піша рэдакцыя „чэснае", як яна сама сябе называе, польскае часопісі. І выходзе нешта назьдзіў дурное: як быццам беларусы ў Заходняй Беларусі, што пад Польшчай, ня лічаць сябе тут дома і заклікаюць усіх перабірацца ў Радавую Беларусь.

Такія мысьлі хоча „Słowo" навязаць нам, прапусьціўшы зумысьля тую часьць нашае стацьці, дзе гаворыцца, што **„крысталізацыя нацыі" адбываецца аднача́сна і ў Заходняй Беларусі**, і перакруціўшы наш **заклік да эмігрантаў з краю, а не да „ўсіх" беларусаў**, каб варочаліся да дому. Вось, як выглядае „чэснасьць" абшарніцкіх газэтных парабкоў!

Не адказваючы на вывады „Słowa", зробленыя з сфальшаванага ім нашага артыкулу, паўтараем яшчэ раз: **дом наш—усюды, дзе жыве беларускі народ, як на ўсходзе, так і на захад ад польска-радавае граніцы.** І гэтага нашага дому, гэтае нашае зямлі мы, як баранілі, так і будзем бараніць, ня гледзячы на ўсю абшарніцкую хлусьню!..

## Змаганьне за родную школу.

### I. Пачаткавыя школы.

Як ведама, у леташнім годзе Соймам быў ухвалены закон з 31.VII. 1924 г. аб школах беларускіх, украінскіх, рускіх і літоўскіх у Польшчы. У свой час аб гэтым законе шмат пісалася і гаварылася; адзначвалася, што гэты закон ня толькі ня дасьць магчымасьці захавацца ўжо істнуючым беларускім школам, ня кажучы ўжо аб адкрыцьці новых, але зусім зьліквідуе або спольшчыць тыя, якія яшчэ захаваліся да выданьня гэтага закону.

Амаль праз паўгода 7. I. 1925 г. Міністар Народнай Асьветы пан Станіслаў Грабскі, аўтар вышэй азначанага закону, выдаў распараджэньне, як праводзіць у жыцьцё гэты закон.

Гэтае распараджэньне ад пачатку да канца заключае ў сабе перашкоды да адкрыцьця беларускіх школаў, затое дае шмат магчымасьцей дзеля ўтварэньня дзьвёх-моўных польска-беларускіх школаў.

Ня гледзячы на шмат перашкодаў, сяляне дружна выступілі на змаганьне за сваю родную беларускую школу і да 31 сакавіка 1925 г. склалі дэкларацыяў аж на 400 беларускіх школ.

Але да гэтага часу ніводная беларуская школа яшчэ не адкрыта, затое-ж урад рыхтуецца тварыць дзьвёх-моўныя польска-беларускія школы.

Гэтакія марныя пакуль што вынікі закону аб школьніцтве для пачаткавых беларускіх школ.

### 2. Сярэднія школы.

Што датычыць сярэдніх школаў—тых нямногіх беларускіх гімназіяў, якія паўсталі і трымаюцца, дзякуючы неймаверным высілкам грамадзянства і ахвярнасьці беларускага вучыцельства, дык на падставе гэтага закону школьныя ўлады таксама робяць замахі на беларускія гімназыі, каб іх спольшчыць або зусім зьліквідаваць. Так Міністар Асьветы п. Грабскі ў цыркуляры з 23. IV. 1925 г. пад № 4022. Д. 25 выясьняе школьным куратарыумам, што, на падставе 7 артыкулу закону з 31. VII. 1924 г., у школах з няпольскаю выкладоваю мовай, г. з. у беларускіх гімназіях, апроч польскай мовы, літэратуры, польскай гісторыі і географіі Польшчы, павінны выкладацца папольску яшчэ агульная геаграфія і агульная гісторыя.

Бачучы супярэчнасьць паміж гэтым выясьненьнем і законам, на які апіраецца Міністар Асьветы ў сваім выясьненьні, Культурна-асьветныя Таварыствы Беларускай Школы ў Вільні і ў Радашкавічах, Літоўскае „Rytas", Жыдоўскі Цэнтральны Асьветны Камітэт і іншыя, утрымліваючыя сярэднія школы, падалі заяву-скаргу ў Вышэйшы Адміністрацыйны Трыбунал аб адмене гэтага выясьненьня, як нязгоднага з духам усяго закону і разбураючага няпольскія прыватныя сярэднія школы, з такім трудом і ў такіх муках нарадзіўшыяся і істнуючыя бяз жаднай дапамогі ад ураду.

Распараджэньне школьных уладаў аб тым, каб агульная гісторыя і агульная геаграфія ў няпольскіх гімназіях і вучыцельскіх сэмінарыях выкладаліся папольску, выклікала вялікае нездаваленьне і гнеў сярод бацькоў вучашчыхся, вучыцельства і наагул шырокіх масаў грамадзянства.

У гэтым распараджэньні грамадзянства ўбачыла небясьпеку для сваіх нацыянальных школаў і востра на гэта зарэагавала.

Культурна-Асьветныя Таварыствы: Беларускія, Жыдоўскія і Літоўскія пастанавілі разам змагацца за правы родных моваў у сваіх нацыянальных школах, дзеля чаго зьвярнуліся да п. Міністра Асьветы з супольным мэмарыялам аб скасаваньні вядомага выясьненьня.

Вось тэкст пададзенага Міністру мэмарыяла:

„Да Пана Міністра Рэлігійных Спраў і Публічнай Асьветы ў Варшаве.

У справе навучаньня агульнай гісторыі і геаграфіі ў польскай мове.

У месяцы ліпені б. г. школы, належачыя да асьветных таварыстваў беларускіх, літоўскіх, жыдоўскіх і гэбрайскіх у Вільні, Сьвянцянах і Радашкавічах, а іменна:

1. Віленская Беларуская Гімназія Таварыства Беларускай Школы ў Вільні, 2. Радашкоўская Беларуская Гімназія Таварыства Беларускай Школы ў Радашкавічах, 3. Літоўская Гімназія імені Вітольда Вялікага Т-ва „Rytas“ у Вільні, 4. Літоўская Гімназія Т-ва „Rytas“ у Сьвянцянах, 5. Літоўская Вучыцельская Сэмінарыя ў Вільні, 6. Гуманістычная Гімназія Жыдоўскага Цэнтральнага Камітэту ў Вільні, 7. Прырода-Матэматычная Гімназія Жыдоўскага Цэнтральнага Камітэту ў Вільні, 8. Вучыцельская Сэмінарыя Жыдоўскага Цэнтральнага Асьветнага Камітэту ў Вільні, 9. Жыдоўская Гімназія ў Сьвянцянах, 10. Гэбрайская Гуманістычная Гімназія імені Доктара Эпштэйна „Тарбут“ у Вільні, 11. Гэбрайская Прырода-Матэматычная Гімназія Т-ва „Тарбут“ у Вільні, 12. Гэбрайская Вучыцельская Сэмінарыя імені Доктара Концтама Т-ва „Тарбут“ у Вільні, а таксама рад іншых атрымалі ліст Куратара Віленскага Школьнага Вокругу ад 25.VI. 1925 г. Д. 11536/25—0, якім Дырэкцыі вышэйадзначаных школ паведамляюцца, што, згодна з выясьненьнем пана Мін. Рэлігійных Спраў і Народнай Асьветы ад 23. IV. 1925 г. Д. 4022/25, навука гісторыі агульнай і геаграфіі ў школьным годзе 1925—26 павінна адбывацца ў польскай мове.

Распараджэньне пана Міністра зрабіла прыгнечанае ўражаньне ня толькі на беспасярэдня заінтэрэсаваныя вучыцельскія сфэры і бацькоў, але і на шырэйшыя кругі ўсей няпольскай люднасьці Віленшчыны. Загад навучаньня адзначаных прадметаў у польскай мове шырокімі кругамі беларускага, літоўскага і жыдоўскага грамадзянства паняты, як удар, скіраваны ў найважнейшую падставу нашага школьніцтва, як акцыя, зводзячая на нішто самыя падставы навучаньня ў роднай мове, забясьпечаныя ў Канстытуцыі Рэчыпаспалітай Польскай. Масы няпольскай люднасьці ў Віленшчыне ў выясьненьні пана Міністра бачаць вялікую небясьпеку для ўсяго іх школьніцтва, з такім вялікім трудом збудаванага ў працягу гадоў.

Што-ж датычыць паглядаў пэдагагічных, то азначанае выясьненьне пана Міністра пазбаўляе вучыцельства найважнейшага — апроч навукі роднай мовы — срэдства ўзгадаваныя розуму і душы дзіцяці, рашуча аслабляе ўсю вартасьць гуманістычнага фактара ў нашых праграмах. Навучаньне агульнай гісторыі і геаграфіі ў польскай мове, якая для нашых дзяцей ня ёсьць роднаю моваю, абнізіць пасьпехі дзяцей, моцна адаб'ецца на роўні гэтых прадметаў, павядзе гэтыя так жывыя і цікавыя кругі веды да мёртвага вэрбалізму і расхалодзіць энэргію нашай моладзі ды заміланьне да навукі.

Бяручы пад увагу азначаныя пагляды нацыянальна-культуральнай уласьцівасьці, а таксама і пэдагагічнай, просім пана Міністра ўзяць назад адпаведнае выясьненьне і дазволіць на навучаньне агульнай гісторыі і агульнай геаграфіі ў роднай мове.

Калі-б гэта просьба не магла быць уважана, просім, дзеля паданьня праз нас скаргі ў вышэйадзначанай справе да Найвышшага Адміністрацыйнага Трыбуналу, аб паўстрыманьні выкананьня адпаведнага распараджэньня аж да разрашэньня справы ў Найвышшым Адміністрацыйным Трыбунале“.

(Ідуць подпісы Таварыстваў).

Усьлед за гэтым з Вільні ў Варшаву паехала да Міністра Асьветы дэлегацыя ад усіх трох падпісаўшых заяву нацыянальнасьцяў з дэпутатамі Ярэмічам і Выгодскім на чале, якая 21 верасьня і была прынята п. Ст. Грабскім. Аб гэтым прыёме—у чародным нумары.

## Бунт у Ломжынскім вастрозе.

30./IX. у вастрозе ў Ломжы ўзьняўся бунт 11 катаржан у знак пратэсту проці пастановы вывязьці 3 вязьняў у Беласток.

Вастрожная ўлада была змушана паклікаць паліцыю ў ліку 30 чал. Вязьні ня пусьцілі паліцыю ў сваю камэру, устроіўшы барыкаду ў дзьвярох з табурэтак, ложак і вадаправодных рураў. Пры ўваходзе паліцыі ў камэру вязьні пачалі біць яе абломкамі і паднялі страшэнны крык з мэтаю выклікаць бунт усіх 500 вязьняў.

Увыніку гэтага 11 паліцыянтаў былі значна пабіты, а камэндант ранены ў твар—вязьняў-жа не ўзялі.

Тады паліцыя пачала страляніну, і цераз 10 мінут вязьні здаліся.

У часе страляніны адзін вязень быў цяжка ранены і памёр,—другі лёгка і яшчэ жыве.

# Заграніцай.

## Узнаўленьне польска-літоўскіх перагавораў.

Польская дэлегацыя выехала ў Люгано (Швайцарыя), дзе маюць распачацца йзноў перарваныя перагаворы Польшчы з Літвою — у справе Кляйпэдзкай умовы (карыстаньня портам Кляйпэды і сплавам па Нёмне).

## Пратэст „беларускага ўраду“.

Рыжскі „Голас Беларуса“ надрукаваў пратэст так-званага „Беларускага ўраду“ ў Празе, скіраваны проці Літоўскага ўраду за тое, што той вядзе перагаворы з польскім урадам..

Пратэст закідае Літоўскаму ўраду зламаньне ўмовы—нікалі не весьці ніякіх — ні тарговых, ні палітычных—перагавораў з Польшчай—інакш, як з Беларуска-Літоўскай сталіцы—Вільні.

## Канфэрэнцыя ў Лёкарно і Чычэрын у Бэрліне.

Уся антанцкая прэса, а перад усім дэлегацыі саюзных дзяржаваў страшэнна абураюцца на тое, што ў часе іх працы, для якой яны выбралі глухое мястэчка, схаванае ад сьвету ў гарах Швайцарыі, Чычэрын сядзіць сабе ў Бэрліне і сваімі „правакацыйнымі заявамі“ журналістам і сталым кантактам з нямецкім урадам псуе ўсю іх музыку і рве ўсю тую „павуціну міру“, якую плятуць для паняволеных народаў найвялікшыя павукі сусьветнага імпэрыялізму.

Нямецкая дэлегацыя, якой вельмі карысна дзеля націску на Англію і Францыю гэтая тактыка Чычэрына (пэўна-ж не без гасьціннага запрашэньня яго ў Бэрлін з боку нямецкага ўраду..), для віду так сама абураецца, кажучы аб „нетактоўнасьці некаторых заяваў радавага міністра“...

## Узмацненьне дыктатуры Мусоліні.

Фашыстаўскі „парлямант“ апрацаваў новы „законапраект“, які яшчэ больш пашырае і паглыбляе дыктатуру Мусоліні ў Італіі. Мусоліні ўжо ня будзе адказным ані перад „парлямантам“, ані перад партыяй, а будзе адказываць толькі „перад каралём“.

Можна толькі прыпомніць тут, што ў мінулым годзе, калі кароль абмежаваў дыктатуру Мусоліні, дык той прыгразіў каралю скінуць яго самога...

## Вайна на валаску!

Вайна між Англіяй і Турцыяй за Мосуль гатова ў кожны мамэнт сарвацца з таго валаску, на якім вісіць. Англійскі міністар калёніяў у сваей апошняй прамове кляйміў тэрор, тасаваны Турцыяй проці хрысьціян у Мосуле, абвінавачваў

# Важнейшыя здарэньні.

# У Польшчы.

## Пачатак соймавай сэсіі.

У аўторак, 6 га кастрычніка, адбылося першае пасьля летняе перадышкі паседжаньне Сойму.

На гэтым паседжаньні прэм'ер Грабскі выступіў з абшырнай праграмнай прамовай, рысуючы ўтварыўшаеся палажэньне і пляны ўраду адносна да „санацыі“.

Настроі сярод соймавых партыяў для п. Грабскага дужа непамысныя, і прэм'еру пагражае выражэньне Соймам недаверыя да ўраду п. Грабскага.

## Жыдоўская дэлегацыя ў прэм. Грабскага.

Перад тым, як прыняць рашучую рэзалюцыю аб пераходзе ў апазіцыю (рэзалюцыя была зьмешчана ў папярэднім нумары), Жыдоўскае Кола ў Сойме выслала да прэм'ера дэлегацыю — ці не здалее яна штось выпрасіць рэальнае — у лік абяцаных цацанак“. Але прэм. Грабскі, дыпляматычна заверыўшы дэлегацыю аб тым, што „ўрад моцна стаіць на груньце паразуменьня з жыдамі“ (стаіць, праўда, цьвёрда, але толькі ня робіць з мейсца ані воднага кроку!...), адаслаў спрытна яе да свайго брата Станіслава... Ведама-ж, той „адкажа“ ляпей!..

## Школы на „Крэсах“.

„Robotnik“ наказуе, што дырэктаты гімназіяў Палескага вокругу выдалі „przepisy karności dla uczniów gimnazjów“.

„Przepisy“ гэтыя — дзікія і ненармальныя; але яшчэ далей пайшоў дырэктар Лунінецкай гімназіі, які ў сябе яшчэ дадаў: „да вучыцеля вучань ня можа падыйсьці, бо гэта—абраза для вучыцеля“; „абеду вучань ня можа есьці ў адным пакоі з вучыцелем“.

Вось, новы дух у школах за часоў п. Ст. Грабскага!

Дык ня дзіва, што ў гімназіях разыгрываюцца гэткія сцэны, як сёлета ў Вільні ў гімн. Лелевэля!

Гэткія адносіны паміж вучнямі і вучыцялямі няўхільна да гэтага вядуць!..

## Міравыя суды на „Крэсах“.

„Robotnik“ перадае цікава-дзікія весткі. Ардынацыя Радзівілаў аддала пад суд 180 сялян за кражу дзерава. Міравы суд у Давігарадку, не дапрашываючы тых 180,—у адзін дзень засудзіў сялян на страшэнныя грашавыя кары. І суд прыказаў кару выканаць ураз-жа.

Хоць справа была перадана ў Акружны Суд, які апраўдаў сялян, але ўсё роўна прадалі ўвесь сялянскі інвэнтар. Пры спрадажы дзеяліся страшэнныя рэчы! Закоўвалі ў кайданы кабет, якія не давалі апошніх кароў!..

# „Адказ на адказ“.

Даўно ўжо было заўважана, што той „Дух Божы“, які калісьці дзеяў і кіраваў у чалавечым грамадзянстве праз рэлігію і царкву, у нашыя часы ад іх адляцеў. Царква даўно ўжо змусіла і змушае грамадзянства служыць ня Богу, але Кесару... Даволі толькі аглянуцца на тое, якую służэбную (каб не сказаць паліцэйскую) ролю йграюць царквы і рэлігіі ў Польшчы, каб зразумець усю праўду гэтага зьявішча.

Зьмяняючы ведамую сярэднявечную формулу, можна сказаць, што цяпер „тэалёгія“ сталася служкай палітыкі...

І вось тую ролю колішніх прарокаў, храніцеляў і бясстрашных вяшчуноў праўды, роль колішніх сьвяшчэньнікаў-вучыцялёў, на якую некалі мела манаполію царква і рэлігія, узяла на сябе — літэратура.

Незалежны духова, хаця мо' й мручы з голаду, пісьменьнік-паэт, сацыяльны рэфарматар-энтузіяст, ці рэвалюцыянэр, народны трыбун-палітык—вось праз каго „многачасна і многаабразна“ гаворыць жывы Бог чалавецтву... Дзеля таго праўда—першы закон для пісьменьніка—вучыцеля народаў.

Праўда,—казаў Леў Толстой,—адзіны запраўдны мэтад літэратуры. „Праўда ў жыцьці, праўда ў навуцы, праўда ў літэратуры і наагул у мастацтве“—вось як формулуе гэты найвышэйшы ідэал расейскай літэратуры адзін з найвыдатнейшых яе прадстаўнікоў—Ганчароў.

Але хтось вельмі трафна сказаў, што „польскі геній“ зьяўляецца нечым проста проціленжным расейскаму... А нядаўна адна з новапаўстаўшых польскіх партыяў дык навет адным з першых пунктаў сваей палітычнай праграмы паставіла барацьбу з тым „панаваньнем ілжы“, якое прадстаўляе сабой сучаснае грамадзкае і палітычнае жыцьцё Польшчы... „У Польшчы залішне многа лгуць“ —пісалася ў афіцыяльным тлумачэньні да гэтай праграмы...

Але запраўдны трыумф гэты „нацыянальны дух“ сучаснай Польшчы сьвяткуе ў толькі што зьявіўшымся ў прэсе зборным адказе польскіх пісьменьнікаў на ведамы беларускаму чытачу паўторны пратэст выдатнейшых літэратаў Францыі проці пануючага ў Польшчы „белага тэрору“. Гэты „чалавечы дакумэнт“, дакумэнт грамадзкага, калектыўнага, на'т запраўды нацыянальнага духа сучаснай Польшчы, выражаючы думкі і пачуцьці найвышэйшых вярхоў польскага грамадзянства — яго „генія“, — варт таго, каб над ім затрымацца...

Каб быць зусім бесстароннымі, будзем карыстацца тым „адказам на гэты адказ“, які дае польская-ж газэта „Robotnik“.

Сама газэта сцьвярджае, што шмат з падпісаўшых „адказ“ належыць да „генаралітэту польскай літэратуры“, а навет былі радыкаламі, „нядаўна яшчэ блізкімі да Партыі Польскіх Сацыялістаў“...

Газэта сцьвярджае, што былыя прарокі польскай літэратуры, стаўшыяся цяпер яе генараламі, зусім навет ня думаюць і не клапоцяцца аб тым, каб шукаць і выявіць праўду... Мала таго: яны ня толькі ня вераць у праўду, яны баяцца яе, яны сьведама і маладушна лгуць „urbi et orbi“—з сваей высокай трыбуны, яны злоўжываюць даверыем сьвету да іх літэратурнага імя і таленту, каб укрываць забойчую для іх айчыны праўду, каб баламуціць сусьветную публічную апінію...

„...Знамянітыя пісьменьнікі стараюцца толькі аб тым, каб разграшыць і апраўдаць пануючую ў нас сыстэму рэпрэсіяў проці палітычных праступленьняў, стараюцца прадставіць усю справу так, быццам аніводная пляма ў гэтай галіне ня пэцкала нашай сьветлай адміністрацыі ані суда“...

Стоючы на вяршыне польскага грамадзянства, адкуль, здавалася-б, найляпей відаць усё, што робіцца навакол іх, польскія пісьменьнікі як быццам „ня ведаюць зла“, ня ведаюць таго, што вычвараецца „пад імі“, аб чым крычаць газэты „блізкіх да іх радыкалаў“, аб чым піша хаця-ж бы газэта „Robotnik“. Для іх усе фактычныя, столькі разоў сцьверджаныя ў абедзьвюх палатах, у судох, у прэсе, нязьлічаныя выпадкі надужыцьцяў улады, гвалту і тэрору—для іх, гэтых „нічога няведаючых дзяцей“,—усё гэта толькі „напасьці на Польшчу“...

„Мы павінны бараніцца“, — кажуць польскія „рыцары Духа“. І вось яны, гэтыя рыцары Духа, лічаць найлепшай, найбольш адпаведнай і карыснай абаронай якраз тую, якую тасуюць—польская паліцыя і польскія даразныя суды, сыплючы прысуды сьмерці, „як з рэнкава“...

„Мы павінны бароцца з тымі ваеннымі і палітычнымі шпіёнамі, якіх насылаюць на наш край нашыя суседзі“...

Але,—адказывае „Robotnik“, — ані францускія пісьменьнікі нічога не казалі аб шпіёнстве, дый ніводнага шпіёна дагэтуль не забілі яшчэ ў Польшчы па прысуду даразнага суда... А забіваюць—за забойствы правакатараў...

Польскія пісьменьнікі божацца перад фран-

# Праект бюджэту на 1926 год.

Сойм прыступіў да першага чытаньня апрацаванага Урадам бюджэту на 1926 г.

Бюджэт апіраецца на прынцыпе ашчаднасьці. Даходаў прадбачыцца на суму 1,889,368,878 зл. (адміністрацыя) — 1,269 001,394; прадпрыемствы — 159,091,584 і манаполь—461,275,900 зл.); выдаткі-ж прадбачацца ў суме 1,887,945,049 зл. (адміністрацыя 1,846,998,585 зл.; прадпрыемствы 24,165,564 і манаполь 16,781,000 зл.). Гэтак даход перавышае выдаткі на 1,423,829 зл. У параўнаньні з сёлетнім бюджэтам прадбачацца меншыя даходы на 8,4%, а таксама й расходы на 9,2%.

Убытак даходаў перад усім датычыць Мін. Скарбу, дзе даход мае раўняцца 1,085,546,416 зл., а ў сёлетнім бюджэце—1,322,581,915 зл.

З беспасярэдніх падаткаў Урад мае надзею атрымаць у 1926 годзе 376,085,000 зл.; — у тым прамысловага падатку мае быць 180 міл., грунтовага — 60 міл., дахадовага — 90 міл., падаткаў ад нярухомасьці 30 міл. З пасярэдніх падаткаў урад спадзяваецца атрымаць 119,865,000 зл., у тым падатак ад цукру мае раўняцца **80.000.000 зл.** (!) З тытунёвае манаполіі спадзяюцца даходу 194,341,000 зл. (у 1925 г.—169,795.000 зл.). З сьпірытусовае—223,440,000 зл. (у 1925 г.—197,500,000 злотых).

Сэнсацыйным зьяўляюцца даходы Цэнтр. Ураду Мін. Выз. Рэл. і Публічнае Асьветы, дзе Урад мае спагнаць даходу 11,498,000 замест 52,800 зл. у 1925 г.

З адпаведніх аб'ясьненьняў вынікае, што **Урад мае падаць у Сойм праект уставу аб штэмплёвых аплатах за школьныя пасьведчаньні! Гэта новы замах п. Ст. Грабскага на незаможную школьную моладзь!**

**Гэтым відаць браты Грабскія маюць забясьпечыць Польшчу ад надпрадукцыі інтэлігенцыі, чаго гэтак баяўся папярэдні Мін. асьветы п. Міклашэўскі!**

Мін. Вайсковых Спраў мае выдаць у 1926 г. 689,000,000 зл. замест 710,000,000 зл. у 1925 г.; Мін. Унутр. Спраў 190,222,584 зл. (а ў 1925 г. — 207,148,937 зл.).

**На школы, пачынаючы ад пачатковых аж да вышэйшых, мае быць выдана** 278,843,227 зл., **значыць на 10,000,000 зл. меней, чым у 1925 г.** Ашчаднасьць п. Ст. Грабскі праводзіць пераважна коштам вышэйшых школаў.

---

Турцыю ў жаданьні нарушыць Лёзанскі Трактат і ігнараваньні Лігі Народаў і перасьцерагаў Турэцкі ўрад проці тых ці іншых „шалёных крокаў“, якія маглі-б выклікаць вайну, пагражаючую самаму істнаваньню Турцыі.

Ня гледзячы на гэтыя ангельскія страхі, Турэцкі ўрад якраз і робіць ўсё „шалёныя крокі“, каб выклікаць вайну, якой зусім не баіцца, ведаючы, што яе сьмяротна баіцца Англія.

Фактычна ўся Турцыя — на ваенным палажэньні. На граніцы Мосулю—100 тысяч войска. Дарданэлы ўкрапляюцца. Усё чужаземцы жывуць пад наглядам ваенна-паліцэйскага кантролю. Нямецкія тэхнікі працуюць над абаронай узьбярэжжаў ад ангельскага флёту.

Туркі ведаюць, што нават 10.000 атрадам могуць заняць Мосуль, бо англінскіх войскаў ў Іраку зусім мала. Ведама-ж, значна дадае ім сьмеласьці і іх ваеннае паразуменьне з Масквой.

### Вайна ў Марокко.

Гішпанія і Францыя трыумфуюць: урэшце, здаецца, удалося ім зламіць, калі ня духовую, дык ваенную сілу паўстаўшых проці іх панаваньня адвечных жыхараў Марокко...

З гады білі паўстанцы гішпанцаў, пакуль ня выгналі зусім з краю.. Тады на помач чорна-тэрорыстычнаму ўраду Гішпаніі прышла „дэмакратычная“ Францыя, настрашаная пагражаўшымі ўжо і яе панаваньню над каляровымі нявольнікамі ў яе Марокко—пасьпехамі Абд Эль Крыма..

Поўгода ўжо, як абедзьве магутныя дзяржавы змабілізавалі ўсе свае ваенныя сілы, каб задушыць паўстаньне жменькі б'ючыхся на сьмерць—за волю і незалежнасьць — арабаў Марокко.. Заняцьце сталіцы Абд-Эль Крыма—Айджыру—значна падарвала веру паўстанцаў у пасьпех Абд-Эль Крыма. Цяпер можна спадзявацца, што ён прыме прапазіцыю аб мірных перагаворах.. Францыя ўжо трэбуе поўнай капітуляцыі (здачы бязумоўнай), хоць абяцуе пакінуць паўстаўшым рыфа-кабілам „аўтаномію“ пад найвышэйшай уладай пастаўленага французамі мароккскага султана.

Добра будзе, калі французы з пашанай зразумеюць, што гэткая геройская барацьба за волю і незалежнасьць даводзіць вялікай духовай і палітычнай дасьпеласьці паўстаўшых народаў, і — не пачнуць імсьціцца і душыць іх, „каб выкараніць назаўсёды гайдамацкі дух“, як гэта робіцца дзе інш.

Запраўды-ж абарона „Мароккскага Львова“— вялікі гістарычны прыклад гераічнае барацьбы за волю народу, а ў нашыя часы супольнага проціімпэрыялістычнага фронту ўсіх паняволеных народаў—мае асаблівае значэньне, калі параўнаваць сілы рыфа-кабілаў з засобамі дзьвёх наймагутнейшых дзяржаваў, так доўга і так няўдала ваяваўшых проці іх.

Праз увесь час барацьбы з Гішпаніяй Абд-Эль Крым біў апошнюю, маючы ў **526 разоў менш байцоў**.. Значная частка ўсяго азбраеньня здабыта паўстанцамі ад пабітых гішпанцаў і французаў.. Калі ў вайну ўмяшалася Францыя, дык проці жменькі паўстанцаў Абд-Эль Крыма ў ліку некалькі дзесяткоў тысяч выступіла саюзная армія ў 10, а ў апошнія тыдні мо' больш як а 15 разоў большая. Даволі сказаць, што Францыя мае на Мароккскім фроньце 3—4 карпусоў—з усімі магутнымі прыладамі сучаснай ваеннай тэхнікі, ня кажучы ўжо аб наймагутнейшым у сьвеце французскім паветраным флёце.. У блякадзе (ваенным даглядзе) мароккскіх берагоў прымаюць учасьце больш як 100 ваенных караблёў вялікіх дзяржаваў, у тым ліку і Англіі—пачынаючы ад браняносцаў і канчаючы падводнымі лодкамі..

Больш месяца гішпанцы бралі Айджыр, і толькі дапамога бамбардаваўшага яго з мора флёту змусіла абаронцаў пакінуць сталіцу... Страшэнных грошаў і ахвяраў каштавала Гішпаніі і Францыі вайна з паўстанцамі. Дык яшчэ далёка да перамогі...

# ХРОНІКА.

**Вобыск у Базыльянскіх мурох.** 7/X сёл. г. на пятай лекцыі ў Віл. Беларускай гімназіі вучні 7-ае і 1-ае клясы не маглі ўвайсьці з перамены ў свае клясы, бо паліцыянт № 966 падпёр дзьверы і ня пушчаў вучняў у клясу. На запытаньне адміністрацыі Гімназіі, чаму гэтак ён робіць, і каб паказаў ордэр, паліцыянт ордэру не паказаў і адмовіўся даць інфармацыі. Праз мінут 15 зьявіўся п. Олэнскі, заступнік шэф-дэфэнзывы з пару дзесяткамі шпікоў і пачаў рабіць вобыск памешканьня Гімназіі і кішанёў вучняў.

Адначасна шэсьць шпікоў рэвідавала інтэрнат і прытулак, шукаючы выбуховых матэрыялаў у кніжках і сшытках дзяцей.

Дзякуючы гэтаму, дзьве апошнія лекцыі ў Гімназіі не маглі адбыцца. У выніку вобыску абсалютна нічога не знайдзена.

Вобыск трываў 3 гадз.; дзеці засталіся без абеду, бо нікога з інтэрнату не выпушчалі. Адначасна адбыўся сьцісла вобыск і ў вучняў прав. дух. сэмін. Вобыск гэты быў выкліканы тым, што старажыха знайшла ў пографе пад царквою дынаміт.

Што датычыць правакацыйнай хлусьні „Dz. Wil.“ аб тым, што дынаміт, які знайшла 2 дні перад рэвізіяй старажыха пад цэркваю, мог быць прывезены з Менску вучнямі беларускае гімназіі, якіх паліцыя арыштавала за пераход граніцы, гэта чародная правакацыя „Dz. Wil.“ бо 1) за ўвесь час істнав. Белар. Гімн. ніводзін вучань ня быў арыштаваны за пераход граніцы, 2) сьцісла вобыск гэты даказаў, што вучні Бел. гімназіі наагул палітыкай не займаюцца, 3) урэшце, як перадаюць судовыя ўлады, дынаміт паходзіць з нямецкіх часоў.

Дырэктар Астроўскі выяжджаць у Варшаву, аб чым піша „Dz. Wil.“, і ня зьбіраўся.

**Кс. Гадлеўскі аб'явіў „галадоўку“.** Аб арышце вядомага беларускага дзеяча, кс. Гадлеўскага, аб якім мы пісалі ў папярэднім нумары, „Biełaruskaja Krynica“ падае гэткія падробнасьці:

Уночы з 29 на 30 верасьня сёл. г. па загаду Сьвянцянскага сьледаваценя арыштаваны вядомы беларускі дзеяч, Жодзішны пробашч кс. В. Гадлеўскі і пасаджаны ў турму на Лукішках. Абвіняюць яго па 130 ст. п. 1.

**Парахвіяне Кс. Гадлеўскага нязвычайна ўзбураны гэтым здарэньнем**, і робяць стараньні прад уладай сьвецкай і духоўнай, каб хутчэй вярнуць назад свайго пробашча.

**Кс. В. Г. на знак пратэсту ў турме нічога ня есьць і морыць сябе голадам.**

Прыпамінаем, што гэта ўжо паўторны арышт. Кс. В. Г. першы раз быў арыштаваны ў месяцы чэрвені сёл. г. і звольнены пад залог 1.000 зл.

**Беларускія мітынгі на правінцыі.** 17 прошлага верасьня адбыўся беларускі мітынг ў м. Шаркаўшчына, Дзісьненскага павету, а 21. IX. такі-ж самы мітынг ў м. Смаргоні, Ашмянскага павету. З прамовамі аб фінансава-гаспадарчым крызісе, аб законах у справе школьніцтва і аб парцэляцыі і асадніцтве выступалі сябры Соймавага Клюбу „Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада“, дэпутаты Пётра Мятла і Сымон Рак-Міхайлоўскі.

**Плады конкордату.** Беларусы каталікі вельмі ўзбураны тым, што, пасьля падпісаньня польскім урадам умовы з папай, палякі распачалі яўны паход проці беларускага духавенства.

Гэтак нядаўна часовы заступнік віленскага біскупа, закляты вораг беларусаў кс. Міхалькевіч, змовіўшыся з рэктарам віленскае каталіцкае духоўнае сэмінарыі кс. Ушыллай, выкінуў з сэмінарыі прафэсара кс. Рэшаця і выслаў яго з Вільні ў Беласток толькі за тое, што ён беларус. З гэтае прычыны беларускія паслы каталікі падалі папскаму нунцыю (прадстаўніку) ў Варшаве заяву, якая вельмі добра характэрызуе нацыянальныя адносіны ў каталіцкай царкве ў Віленшчыне.

У заяве гаворыцца:

„Беларусы-каталікі ўжо ня раз праз Вашу Ексцэленцыю прадстаўлялі Сталіцы Апостальскай справу дужа ненармальных адносінаў у сваім жыцьці рэлігійным, свае крыўды адсюль выплываючыя, а так-жа спосабы, якімі можна было б прынясьці палёгку ў гэтым цяжкім палажэньні.

Цяпер ізноў зьвяртаемся да Вашай Эксцэленцыі, выказваючы крыўду сваю, якая нас спаткала ў Віленскай Дыэцэзыяльнай Духоўнай Сэмінарыі.

---

цускімі, быццам „большасьць польскага грамадзянства—проці кары сьмерці“... Але, што яму рабіць, калі дагэтуль яшчэ ў яго пекнай, дэмакратычнай Айчыне істнуюць і пануюць агідныя ўгалоўныя кодэксы, накінутыя краю ўрадамі заборчых дзяржаваў... Польскае грамадзянства „працуе над зьменай гэтых кодэксаў, а суды стараюцца як найрадзей тасаваць прадбачаную ў іх кару сьмерці“...

„Robotnik“ сцьвярджае, што ўсё гэта—ад першага да апошняга слова—брахня і хлусьня...

Калі ў Устаноўчым Сойме была пачата барацьба проці кары сьмерці, дык ня толькі „большасьць польскага грамадзянства“ маўчала, але маўчалі навет і ўсе тыя „зоркі польскай літэратуры“, тыя „выбранцы польскага народу“, якія цяпер зусім бяз права на гэта раптам загаварылі.

Дзе і хто „працуе над зьменай“ агідных кодэксаў,—таксама няведама „Работніку“, як і нам... І зноў—хлусьня „на вываз“. Але трэба паправіць паноў літэратаў-патрыётаў яшчэ і ў тым, што яны, ці па няведаньню, ці зумысна, валяць на „заборчыя кодэксы“.—Напрыклад, расейскі кодэкс ня ведаў кары сьмерці... Яна была ўведзена ў Расеі толькі ў парадку розных „вынятковых станаў“ ці „ахранаў“, а ў Польшчы — немцамі ў часы акупацыі. Дык чаму гэта „большасьць польскага грамадзянства“, якое гэтак „праціўна кары сьмерці“, як толькі яно атрымала ўладу ў сваей уласнай дзяржаве, дачакаўшыся гэтага цуду і сьвята, увяла ў свае суды не расейскі кодэкс, няведаючы кары сьмерці, але якраз спрэчны з ім „ахранна-акупацыйны рэжым“, на падставе якога і завяліся ў Польшчы тыя „даразныя суды“, аб якіх польскія мастакі запраўды-ж памастацку дэлікатна выражаюцца, як аб „судох з скарочаным ходам працэдуры“...

„Нязгодна з праўдай, — далікатна кажа „Robotnik“, — і тое, што кажуць „мастакі“ — быццам „даразныя суды тасаваны вельмі рэдка,—толькі ў выпадках асабліва зьверскага забойства“. Але праўда тое, што гэтыя „скарочана-сьмертаносныя суды“ тасуюцца ўсюды і заўсёды ў выпадках забойства правакатараў і агентаў паліцыі“...

Таксама, як даразныя суды, рыцары польскай праўды бяруць пад сваю высокую ахову і польскія вастрогі і паліцэйскія цыркулы і пастарункі... Урачыста і з трыумфам яны „сцьвярджаюць“, быццам ведамая ўсяму сьвету „апінія“ гэтых польскіх установаў, якім нядаўна тыя-ж французскія палітычныя і грамадзкія дзеячы закідалі арганізаваныя катаваньні, абелена аканчальна. Цяпер паўтараць гэтае „агіднае абвіненьне“ ўжо ніхто ня мае права, пасьля таго, як самым абвініцелям польскі ўрад даў поўную магчымасьць сцьвярдзіць усю няпраўду гэтага агіднага закіду польскім вастрогам і польскай паліцыі...

Так пішуць польскія пісьменьнікі да сваіх французскіх калегаў.

І вось і тут „Robotnik“ сцьвярджае — або „дзяціннае няведаньне“, або сьведамую брахню...— У запраўднасьці было толькі тое, што пад націскам ізноў тэй-жа заграгічнай публічнай апініі Польскі Сойм выбраў камісію, якая аб'ехала некалькі вастрогаў, пыталася некаторых вязьняў—у прысутнасьці вастрожнага начальстве—ці катуюць іх, ці не катуюць...

Але і тая соймавая камісія дагэтуль не зрабіла выбраўшаму яе Сойму ніякае справаздачы— дзеля абструкцыі рэакцыйнай большасьці камісіі, якая баіцца голасна сказаць праўду... Гэтак узапраўднасьці выглядае гэнае запярэчаньне „фальшывага абвіненьня“, на якое пазываецца адозва польскіх пісьменьнікаў...

---

Запраўды—трэба мець шмат „маральнай адвагі“, каб, заткнуўшы вушы і закрыўшы вочы на ўсё, што робіцца навакол, пратэставаць проці таго, што чужаземныя пісьменьнікі бяруць на сябе той сьвяты абавязак, ад якога з гэткай агіднай маладушнасьцяй адхіляюцца ў сваім краі „духоўныя правадыры“ польскага грамадзянства...

Польскія пісьменьнікі трэбуюць, каб іх „паньству“ далі „ўласным шляхам ісьці да сьветазарнай будучыны чалавецтва, дзе роўнасьць, воля і брацтва будуць праведзены ў жыцьцё“.

Дык ці-ж,—слушна кажа „Nasz Przegl.“, бяскарна пануючае і шалеючае пад высокай аховай духоўных правадыроў Польшчы — зьверства, хамства і бяспраўе — запраўды найбольш адпаведны і найкарацейшы „ўласны шлях“ да гэтай „сьветлай будучыны“?! „Ужо сёмы год Польшча йдзе гэтым „уласным шляхам“, а дагэтуль гаспадарства йдзе штось не да сьвятла—не наперад, але, наадварот, ідзе назад—да цемры“.

Абарона гэтага „ўласнага шляху“ да цемры з боку найсьвятлейшых прадстаўнікоў польскай інтэлігенцыі—ня толькі бяспрыкладнае надужыцьцё друкаванага слова і даверыя шанаваўшых іх імёны чытачоў, ня толькі здрада свайго прызваньня, але і запраўды праступак перад чалавецтвам. Гэта—тая „хула на Духа“ праўды, якая ня будзе даравана вавек.

Віленская Дыэцэзія, як мы ўжо інфармавалі Вашу Экцэленцыю, у большасьці сваей заселена беларусамі.

Працэнтныя адносіны беларусаў-каталікоў у Віленскай Дыэцэзіі прадстаўляюцца гэтак: у пав. Дзісьненскім, Вялейскім, Дунілавіцкім і Валожынскім беларусаў-каталікоў налічаецца да 95 проц.; у пав. Віленскім, Лідзкім, Сьвянцянскім і Ашмянскім—да 60 — 70 проц. (Аб частках тэрыторыі Дыэцэзіі Віленскай, маючых адыйсьці да дыэцэзій суседніх, цяпер не ўспамінаем).

Вось-жа, Дыэцэзіяльная Духоўная Сэмінарыя ў Вільні з гэтым фактычным палажэньнем зусім ня лічыцца, астаючыся і на далей інстытуцыяй полёнізуючай каталікоў-беларусай.

У сэмінарыі гэтай **ня толькі дасюль не ўвялі неабходных для прышлых пастыраў нашага народу прадметаў, як беларуская мова, літэратура, гісторыя Беларусі, але не дапускаюць да яе прафэсароў ксяндзоў беларускай народнасьці.**

Нядаўна адзіны беларус прафэсар Сэмінарыі Кс. др. Я. Рэшэць, добры і сьветлы пэдагог, чалавек пабожны, на прапазіцыю Рэктара Сэмінарыі Кс. Я. Ушыллы, праз Біскупа Суфрагана Кс. Міхалькевіча з пасады звольнены.

Гэта поўная дзеля нас несправядлівасьць, найвыразьней падыктаваная палітыкай, бо прычыны, якія падае Рэктар Сэмінарыі, як патрэба зьменшаньня ліку прафэсароў, станоўчай ролі іграць не маглі.

Зважаючы на лічбовую перавагу каталікоў-беларусаў у дыэцэзіі, звычайная справядлівасьць мусіла-б запэўніць Кс. др. Я. Рэшэцю мейсца прафэсара ў Духоўнай Сэмінарыі ў Вільні.

Падаём гэта да ведама Вашай Эксцэленцыі і адначасна просім пераслаць гэта Яго Сьвятасьці сьв. Айцу". 1./X. 1925 г.

**Думаем, што гэты зварот аб справядлівасьць да „сьвятога айца"—зусім бязмэтны: не на тое-ж папа падпісаў конкордат, аддаючы каталікоў-беларусаў на ласку ці няласку палякоў, каб цяпер за тых-жа каталікоў-беларусаў заступацца!**

**ГРАМАДЗЯНЕ!** закладайце для сваіх дзяцей прыватныя беларускія школы там, дзе няма ніякай школы, або дзе ўрад не перарабляе польскай школы на беларускую, згодна выказанага жаданьня бацькоў праз дэкларацыі.
Інструкцыю, як адчыніць прыватную беларускую школу, можна выпісаць з Цэнтральнай Беларускай Школьнай Рады (Wilno, Wileńska 12—6), з Радашкаўскага Тавар. Беларускай Школы (Radoszkowicze ziemi Wileńskiej), і з Наваградзкага Т-ва Беларускай Школы (m. Nowogródek).

# З жыцьця Горадні.

## Вось табе і школа.

Беларусы, ці выпаўнілі вы свой абавязак і падалі дэкларацыі на 1925—26 школьны год да 31-га сакавіка 1925 г., каб мець сваю беларускую школу?

На гэтае пытаньне зусюль чуваць голас: „Але-ж, выпаўнілі".

А вось, 3 га верасьня 1925 года на запытаньне нашага карэспандэнта ў школьнага інспэктара ў Горадні, ці ў наступаючым 1925—26 школьным годзе згодна з жаданьнем беларускага насяленьня Горадзеншчыны адчынена хоць адна беларуская школа, — пан інспэктар Шульц даў адказ ясны і кароткі: беларускай школы на 1925—26 год адчыненай няма ніводнай. Як будзе далей, дык ён, інспэктар, ня ведае, бо ўсё гэта залежыць ад беластоцкага куратoрыуму.

Трэба адзначыць, што, ня гледзячы на ўсе перашкоды, робленыя мясцовай адміністрацыяй у справе падачы школьных дэкларацыяў, падана дэкларацыяў бацькоў або апякуноў на адкрыцьце **22-х беларускіх школ.**

1925—26 школьны год ужо ад 1-га верасьня распачаўся, але з лічбы 22 няма ніводнай беларускай школы.

Дык наракаюць сяляне: „падаткі плацім усялякія, а калі ня маеш чым плаціць, дык забіраюць у цябе апошняе, самае неабходнае, а пра школу беларускую і ня пытай, бо яе ня будзе!..

Дык вось і „языковыя законы": памаглі яны нам, як нябожчыку кадзідла...

## Камуністычная дэманстрацыя.

6 верасьня адбылася ў Горадні дэманстрацыя камуністычнай моладзі лікам да 300 чалавек з прычыны ўгодкаў закладзінаў „камсамолу".

## Арышты.

Ад 6 верасьня ў выніку з вобыскамі і арыштамі ў Горадні і павеце налічываецца да 200 арыштаваных.

## Прыезд дэпутата.

18 і 19 верасьня быў у Горадні дэпутат Сойму з Беларускай Сялянска-Работніцкай грамады гр. Валошын ў справе арыштаў.

Дэпутат прыехаў з Беластоку, дзе рабіў заходы аб выясьненьні арыштаў у Беластоцкага пракурора п. Зубелевіча.

## Палітычны працэс „33".

23 лістапада 1925 г. ў Горадзенскім акружным судзе будзе разглядацца палітычная справа 33 чалавек: Рукшы Казіміра, Яткоўскага, Галынскага, Пружанскага, Фінка, Добка, Стамблера і інш., абвінавачаных з арт. 102 К. К. часьць І.

З іх 31 чалавек сядзяць у вастрозе ў Горадні, а 2—на свабодзе. Сядзяць з красавіка 1923 г. г. ё. трэці год. **Альфа.**

# Карэспандэнцыі.

## Мартыралогія беларускага школьніцтва.

(З Слонімшчыны).

Таварыства Беларускае школы ў Радашкавічах яшчэ ў лістападзе і сьнежні 1924 году ды ў лютым і студзені 1925 г. паслала просьбы Куратару Беластоцкага Вокругу праз Школьнага Інспэктара ў Слоніме аб канцэсіі на прыватныя Беларускія школы ў Слонімскім павеце ў вёсках: Чэмеры, Савічы, Пруды, Малы-Угрынь, Лядзіны, Сьцяткоўшчына, Рудаўка і Задвор'е (—на восем школаў) з усімі патрэбнымі залучнікамі і да гэтай пары ніякага адказу ад Куратара няма.

Другі раз паўтарыла просьбу ў ліпні дня 21 сёлетняга году, але і ізноў ні слуху.

На пачатку жніўня с. г. паслалі просьбы яшчэ на пяць прыватных школаў у вёсках Грабава, Хвіневічы, Азарычы, Скіпаровічы і Сліжы-Пясковыя, просячы Куратара даць рэзалюцыю на пачатак школьнага году. І ізноў дагэтуль ніякага адказу—ці то дазволу, ці недазволу.

Гэтыя 13 прыватных школаў працавалі ўжо некалькі тыдняў, чакаючы канцэсіі. Ажно-ж канцэсій як ня было, так і няма-ш, а школы Слонімскі Інспэктар і Староста пазакрываў; вучыцельства заарыштавалі, ды пасьпісвалі пратаколы і пацягнулі ў суд з арт. 290 К. К., а некаторых ужо аштрафавалі за тое, што вучылі.

Апрача вучыцялёў, пацягнулі ў Акружны Суд у Горадні б. солтыса вёскі Задвор'е, Базыля Сіняка, з арт. 639 ч. ІІ К. К. за тое, што не данёс уладзе аб школе, ды таксама солтыса вёскі Хвіневічы, Дазіла Сцецька; апрача таго, гаспадароў, дзе была школа ў Хвіневічах, Максіма Сіўка, і дзе жыла вучыцелька школы Вера Катрач, Міхася Пархача за тое, што далі памешканьне.

Суд у Слоніме судзіў 12 верасьня вучыцельку Марыю Шундрык, са школы ў Азарычах, а на 29 верасьня быў назначаны суд у Дзятлаве на вучыцельку Веру Катрач са школы ў Хвіневічах і пэўне асудзяць на штраф колькідзесят залатых або на адседку з арт. 290 К. К.—Перад гэтым вучыцельку з школы ў в. Пруды, Н. Капітончык, аштрафавалі штось на 120 зл., а вучыцелька ў школе з в. Лядзіны М. Белаусава сядзіць і цяпер у вастрозе ў Слоніме за школу.

Гэтак 13 прыватных беларускіх школ у самым толькі Слонімскім павеце зачынены, а 11-ты месяц ідзе, як паданы просьбы аб канцэсіі на гэтыя школы, і з вучыцельства ды з людзей зроблены ахвяры.

Тымчасам Міністэрства Асьветы ў паперы з дня 27 лютага 1925 г. за № 1283/25. О. Прэз. ў адказ на інтэрпэляцыю пасла Рагулі і тав. у справе перасьледаваньня і зачыняньня беларускіх школ кажа, што быццам нічога падобнага няма. І вось вынятак з гэтага адказу:

> „...аб перасьледаваньні Беларускага школьніцтва няма і гутаркі. На практыцы да гэтага часу ня было выпадку, каб Кураторыя адмовіла ў канцэсіі на адкрыцьце прыватнай школы з беларускай мовай навучаньня, а істнуючыя ад бягучага году прыватныя школы ані беларускія арганізацыі не стараліся дагэтуль, каб аткрыць школы. Дзеля гэтага няма падставы да рэвізіі палітыкі нацыянальнага перасьледаваньня беларусаў, бо перасьледаваньне такое запраўды ня істнуе, а тым менш палітыка ў гэтым напрамку".
>
> Падпісаў: Кір. Мін. Др. Я. Завідзкі.

Дык вось для Міністэрства перасьледаваньня беларускіх школаў няма, а на дзеле канцэсій на школы не даюць, з адказам сумысьля адкладываюць і школы закрываюць, а вучыцельства судзяць, ды штрафуюць. **Г. Л—к.**

## „Наварачываюць".

(Наваградчына).

У беларускай газэце, аднадвёўцы „Селянін" ад 8/VIII г.г. была зьмешчана карэспандэнцыя: „Наваградзкае староства агітуе проці беларускае школы. Гэная газэта нейкім шляхам папала ў Наваградзкае староства, дзе яна, як відаць, надта не спадабалася, бо 30/VIII г.г. ў Цырынскую гміну прыяжджаў заступнік старосты дзеля „натхненьня" вясковых солтысаў, каб шчыра зьбіралі падаткі, і прывёз з сабою газэту, якая была адрасована на вёску Каймоўкі, Цырынскае гміны, Сяргееву Антону.

Перад усім, заступнік старосты паклікаў у ціхі куточак солтыса вёскі Каймоўкі, разлажыў перад ім газэту і пачаў ціханька пытацца, ці ёсьць у вёсцы Каймоўках прозьвішча Няшчасны? Калі-ж аказалася, што гэткага няма, дык „левая рука старосты" пачаў таксама ціханька чытаць карэспандэнцыю. Прачытаўшы, ён яшчэ раз папытаўся, мо' ёсьць Няшчасны. А потым пачаў дапытывацца, ці запраўды хто прыяжджаў у справе школы і хто іменна.

Аказалася, што гэта быў Курачыцкі Уладак з вёскі Даўматаўшчына, Жухавіцкае гміны, вучыцель Цырынскае польскае школы, а разам і кіраўнік Цырынскага школьнага абводу, і з ім другі вучыцель з мястэчка Цырына. У Цырынскай гміне ёсьць толькі дзьве школы і то — польскія, у м. Цырыне, а ў вёсках ніякіх школаў няма.

Заступнік старосты абяцаў вінавайцаў нарушэньня закону пакараць, але штосьці ня чутно.

Гэныя самыя хваты, Курачыцкі з сябрам, 24 красавіка былі ў Асташыне і Любанічах з тэй-жа самай мэтаю і пайшлі з тымі-ж самымі вынікамі, што і ў Каймоўках.

29 траўня г.г. ў вёску Асташын прыяжджаў, як ён назваўся, паўнамоцнік Наваградзкага інспэктара. Паўнамоцнік інспэктара быў хітрэйшы за Курачыцкага, бо ён ня зьбіраў сходу, а загадаў, каб кожын бацька дзяцей зьяўляўся да яго ў адзіночку. От тут-та і была споведзь, от тут-та і гаварылася аб „польскім раі" і „беларускім пекле". Ад гэтага страху ў Асташыне згадзіліся на дзьвохмоўную школу два бацькі, а ў Любанічах тры, бо, як яны казалі, баяліся, каб пан не пагнаў іх ў Наваградак у турму. У першы дзень працы паўнамоцніка інспэктара было ў вёсцы мала людзей, бо было сьвята Усшэсьце, і шмат разьехалася. Калі-ж паўнамоцнік пачаў сваю працу на другі дзень, дык тут зьявіліся людзі, якія пачалі пярэчыць паўнамоцніку ў яго місіі. Але паўнамоцнік з імі доўга не гаварыў, а тут-жа павыганяў вон, крыкнуўшы: „Ja wiem, że tutaj są białoruscy nauczyciele i oni chcą posady, ale tego nigdy nie było i nie będzie! Ja z wami będę rozmawiał drugim razem i o drugiem"—і што-ж, паразмаўлялі з 19 на 20 жніўня... Гэткія выпадкі здараліся ня толькі ў Цырынскай гміне, але й па ўсёй нашай многапакутнай Заходняй Беларусі. **Ю. Хмурны.**

# З Радавае Беларусі.

**Беларускія пісьменьнікі за граніцай.** Выехаў з Менску ў Нямеччыну Цішка Гартны. Хутка зьбіраюцца паехаць у Нямеччыну і Чэха-Славакію Янка Купала і Міхась Чарот.

**Навуковая камандзіроўка за граніцу.** Выехаў з Менску ў навуковую камандзіроўку ў Польшчу, Чэха-Славакію, Літву і Нямеччыну рэктар Белар. Унівэрс. ў Менску праф. В. Пічэта.

**Юбілей Бядулі.** 23 гэт. мес. будзе сьвяткавацца ў Менску 15-гадовы юбілей літэратурнай дзейнасьці Зьмітрака Бядулі (Плаўніка). Першы яго твор „Пяюць начлежнікі" друкаваўся ў Вільні ў „Нашай Ніве" ў 1910 годзе.

Друкуецца й хутка выйдзе з друку
**Беларускі АДРЫЎНЫ Календар (1926 г.)**
Галоўны склад і кіраўніцтва Беларуская Кнігарня (Вільня Завальная 7).
Цана прадбачыцца 2,50 зл.; асобы, якія прышлюць грошы цяпер, дастануць календар за 1,50 зл. Хто адразу купляе ня меняй 5 шт., будзе мець 20 проц. скідкі.

ПАСЬЛЯ ЛЕТНЯГА АДПАЧЫНКУ
**„Авадзень"**
багата-люстраваны гумарыстычны журнал—пачынае ізноў акуратна выхадзіць.
Старых нашых знаёмых і прыяцеляў запрашаем да чыннага супрацоўніцтва.
„АВАДЗЕНЬ" будзе пасылацца толькі за грошы.
Хто перадплаты не надаслаў, просім парупіцца.
ЦАНА на год — 7 зл.
„ „ 1/2 — 3.50
„ „ 3 м. — 1.80
За граніцу на год тры даляры.
Адрас: Wilno, Zawalna 7
(пры кнігарні).

Рэдактар-Выдавец: Ул. Варавва.
Друкарня Н. Левін і Сын, Вільня, Нямецкая 22.